*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 2 (433)

Аўторак 24 студзеня 1961 г.

Цана 1 кап.

**ТАВАРЫШ!**

**НАБЛІЖАЮЦЦА ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ, ТЫ ПАЕДЗЕШ АДПАЧЫВАЦЬ ДАДОМУ. НЕ ЗАБУДЗЬ У ЧАС КАНІКУЛ ЗАЙСЦІ Ў СВОЙ КАЛГАС, НА СВОЙ ЗАВОД, У СВАЮ ШКОЛУ. РАСКАЖЫ МОЛАДЗІ АБ УНІВЕРСІТЭЦЕ, АБ ЯГО ФАКУЛЬТЭТАХ, СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ. ПАМЯТАЙ, ШТО АД ЦЯБЕ Ў МНОГІМ ЗАЛЕЖЫЦЬ, ЯКІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ ПРЫДУЦЬ У НАШЫ АЎДЫТОРЫ 1-ГА ВЕРАСНЯ 1961 ГОДА.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**

## Ідэі маскоўскай нарады— здабытак кожнага

Маскоўская нарада прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый была адной з самых знамянальных падзей мінулага года. У Заяве, прынятай на нарадзе, а таксама ў Звароце да народаў усяго свету выразілася адзінадушнасць і згуртаванасць усіх партый у іх барацьбе за мір, за будучае чалавецтва.

Партыйны камітэт універсітэта намеціў шэраг мерапрыемстваў па вывучэнню дакументаў Маскоўскай нарады. Ідэі Заявы прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый, а таксама Зварот да народаў усяго свету павінны стаць здабыткам кожнага выкладчыка, аспіранта, студэнта.

Матэрыялы нарады будуць вывучацца ва ўсіх гуртках палітасветы. Вывучэнне матэрыялаў нарады будзе ўключана ў расклад заняткаў на ўсіх курсах факультэтаў.

У лютым адбудзецца аб'яднанае пасяджэнне кафедраў грамадскіх навук і кафедраў гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў, прысвечанае абмеркаванню матэрыялаў нарады. На гэтым пасяджэнні будзе прачытана некалькі дакладаў. Сярод іх такія—«Камуністычны і рабочы рух на сучасным этапе», «Новы этап агульнага крызісу капіталізма», «Крызіс ідэалогіі антыкамунізма» і іншыя.

Шэраг дакладаў, прысвечаных нарадзе, будзе ўключан у праграму агульнаўніверсітэцкай навуковай сесіі, якая адбудзецца ў лютым. На студэнцкай навуковай канферэнцыі таксама будуць прачытаны даклады, прысвечаныя нарадзе.

Шэраг тэарэтычных канферэнцый, гутарак правядуць выкладчыкі ўніверсітэта на заводах і ў калгасах. Гэта дасць магчымасць рабочым і калгаснікам глыбей і лепш азнаёміцца з матэрыяламі Маскоўскай нарады.

## На рашэнні Пленума адкажам выдатнай вучобай!

☆ ☆ ☆ ☆

### Мы — з партыяй

З вялікай увагай сачылі мы за ходам работы Пленума ЦК КПСС. Пленум падвёў вынікі тых дасягненняў, таго пад'ёму ў галіне сельскай гаспадаркі, якія мы заўважаем на кожным кроку. Разам з тым Пленум намеціў перад савецкім народам шэраг бліскучых перспектыў, якія яшчэ хутчэй наблізяць пабудову камунізма ў нашай краіне.

Кафедра палітэканоміі БДУ ў сувязі з гістарычнымі рашэннямі Пленума ЦК КПСС намеціла рад мерапрыемстваў, якія будуць праведзены ў бліжэйшы час. У студзені гэтага года кафедра правядзе ў сельгасарцелі «Кастрычніцкая рэвалюцыя» Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці эканамічную канферэнцыю. Дацэнт В. Цакуноў выступіць перад калгаснікамі з дакладам.

Канферэнцыі, якія робяцца ўжо не адзін год, праходзяць заўсёды цікава, у атмасферы дзелавой размовы і гарачай палемікі. Працаўнікам калгасных палёў ёсць аб чым паразмаўляць і паспрачацца з вучонымі, і асабліва ў гэтыя дні, калі толькі што скончыў сваю работу Пленум ЦК КПСС.

**М. ЯРАВІКОЎ,**

### Радасная падзея

Восем дзён позіркі савецкіх людзей былі накіраваны да сэрца нашай Радзімы—Масквы. Восем дзён пасланцы партыі і народа абмяркоўвалі пытанне далейшага развіцця сельскай гаспадаркі краіны. Партыя паставіла перад савецкім народам задачу: значна павялічыць вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў і дабіцца такога становішча, каб вытворчасць малака, мяса, масла і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў апярэджвала попыт насельніцтва. Дакладчыкі і выступаўшыя на Пленуме перадавікі сельскай гаспадаркі гаварылі аб канкрэтных мерапрыемствах па ўздыму калгаснай і саўгаснай вытворчасці, шукалі і знаходзілі рэзервы далейшага развіцця эканомікі краіны. Многа карысных і патрэбных заўваг зрабіў на Пленуме Першы сакратар ЦК КПСС Старшыня Савета Міністраў СССР Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.

Хвалю працоўнага энтузіязма выклікала рашэнне толькі што прайшоўшага Пленума аб скліканні ў гэтым годзе XXII чарговага з'езда КПСС. Савецкі народ рыхтуецца сустрэць з'езд роднай Камуністычнай партыі новымі поспехамі ў развіцці народнай гаспадаркі краіны.

Каб унесці свой уклад у агульнанародную барацьбу за выкананне пастаноў Пленума ЦК КПСС, студэнты аддзялення журналістыкі рашылі ў час зімовых канікул правесці па дзве—тры гутаркі з калгаснікамі, рабочымі і моладдзю па матэрыялах Пленума.

**В. КАВАЛЬКОЎ.**

# ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ



*У КОРПУСЕ гуманітарных навук у гэтыя дні шумна і многалюдна. Тут здаюць экзамены філолагі, гісторыкі і юрысты. Куды б вы ні глянулі ў гэты час: на любы паверх, у любую аўдыторыю, на лесвіцу—усюды вы ўбачыце студэнтаў, горача размаўляючых аб толькі што здадзеным экзамене, аб тым, што ўжо паўторана і што яшчэ застаецца падвучыць...*



*Другі курс рускага аддзялення сёння здае экзамен па рускай літаратуры XIX стагоддзя. Ля дзвярэй адной з аўдыторый—група дзяўчат.*

*—Ой, дзяўчаткі, як боязна! — гаворыць сваім сяброўкам Фаіна Рымша.— Зараз жа мне трэба заходзіць.*

*І вось Фаіна ўжо сядзіць перад экзаменатарамі. Наш фотакарэспандэнт Віталі Анцыфераў якраз «схапіў» гэты момант. Выкладчыкі літаратуры Язэп Васільевіч Зазека і Раіса Барысаўна Паіна адказам Фаіны задаволены. Змястоўны адказ— выдатная адзнака. Дарэмна хвалявалася Фаіна!*

*А якраз ў гэты час студэнтка III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Валя Конаш (сярэдні здымак) задумалася над пытаннямі свайго білета. Яна здавала псіхалогію. Так пытанні нялёгкія. Вядома, псіхалогія—навука складаная, але Валя разабралася ў пастаўленых пытаннях. Дацэнт т. Ерась паставіла ёй добрую адзнаку. Аляксандр Цалко, якога вы таксама бачыце на здымку, атрымаў «выдатна».*

*Валянціна Жвалеўскага (здымак унізе) абступілі аднакурснікі. А ў яго выдатны настрой. Ён толькі што здаў экзамен па літаратуразнаўству, першы экзамен ва ўніверсітэце. І гэты першы блін, як кажуць, не быў комам. Студэнт першага курса аддзялення журналістыкі Валянцін Жвалеўскі атрымаў сваю першую выдатную адзнаку.*

*—Вось бы і нам так!—думаюць яго таварышы, у акружэнне якіх ён трапіў адразу пасля здачы экзамена.*

*Анатоль ЗАЛЕЎСКІ.*



### Хочацца вучыцца яшчэ лепш

Вестка аб скліканні чарговага XXII з'езда партыі была сустрэта студэнтамі з вялікім натхненнем. Гэтае радаснае паведамленне знайшло самы гарачы водгук у сэрцах кожнага з нас. Мы пакуль што вучымся, таму вучоба для нас—тая галіна, дзе мы можам прыкласці ўсе свае сілы і намаганні.

Гэтымі днямі мы закончылі здаваць зімовую экзаменацыйную сесію. Што можна сказаць аб яе выніках? З 28 чалавек чацвёртага курса аддзялення журналістыкі ні адзін студэнт не атрымаў адзнакі «нездавальняюча». Няма і такіх, якія не здалі-б залікаў. Я асабіста здаў гэтую сесію на «выдатна». «Выдатна» па ўсіх прадметах атрымалі таксама Я. Пракоп'еў, В. Кавалькоў, М. Гусак, Н. Кліменка. Многія здалі экзамены на «чатыры» і «пяць». Гэта наш уклад ва ўсенародную справу барацьбы за светлае будучае чалавецтва, за выкананне гістарычных рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС.

**А. ПАДБЯРОЗНЫ.**

# Юбілей выдатнага вучонага

Гэтымі днямі грамадскасць універсітэта шырока адзначыла 100-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага вучонага Е. Ф. Карскага.

18-га студзеня ў корпусе гуманітарных факультэтаў сабраліся прафесары, дацэнты, выкладчыкі ўніверсітэта, студэнты. Усе яны прышлі на навуковую сесію, прысвечаную вялікаму беларускаму філолагу.

Цікавымі былі жыццё і дзейнасць прафесара Карскага. Аб гэтым і расказала ў сваім дакладзе доктар філалагічных навук М. А. Жыдовіч. Вось некаторыя звесткі з біяграфіі Е. Ф. Карскага. Нарадзіўся ён у Гродзенскім уездзе той жа губерні. Яго бацька быў вясковым настаўнікам. Хлопчык спачатку скончыў народнае вучылішча, а затым паступіў у Мінскае духоўнае вучылішча. Як лепшага вучня яго накіроўваюць у Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут. Хутка Карскі становіцца вучоным-мовазнаўцам. Упершыню ў гісторыі мовазнаўства ім была напісана і выдатна абаронена магістэрская дысертацыя па беларускай мове. Услед за гэтай работай паследвалі іншыя працы па беларускай літаратуры, этнаграфіі, фальклору. Некалькі год Карскі з'яўляецца рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта, затым, ужо пасля Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі, выкладае ў Ленінградскім універсітэце. Шэраг яго работ па рускай, беларускай, украінскай мовах адзначаны прэміямі і медалямі. Карскі вельмі многа зрабіў у 1919 годзе па стварэнню Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна. Памёр ён у 1931 годзе.

З дакладам «Карскі—лінгвіст» выступіў дацэнт А. Я. Бірала. Даклад «Карскі—фальклярыст» зрабіў выкладчык універсітэта, паэт Ніл Гілевіч.

На навуковай сесіі прысутнічалі супрацоўнікі інстытутаў мовазнаўства і літаратуры пры Акадэміі Навук БССР, дацэнт Кіеўскага ўніверсітэта тав. Цімашэнка.

# Пісьмы ў рэдакцыю

## Нам патрэбна дапамога

У завочнікаў да пачатку сесіі засталося зусім мала часу. Хутка яны з'едуцца ва ўніверсітэт ад станкоў і калгасных палёў. Кожнаму патрэбна будзе паказаць, чаму ён навучыўся за прайшоўшы семестр, што карыснага ўзяў ён для сябе. І зусім зразумела, што сесія для завочніка—самы гарачы і турботны час. Усё ж яны працуюць, і для падрыхтоўкі да сесіі не вельмі ўжо многа часу.

У нас, завочнікаў, ёсць прэтэнзіі да дэканата завочнага факультэта і да яго некаторых выкладчыкаў. Нам здаецца, што завочнікам удзяляецца недастаткова ўвагі. Ёсць многа пытанняў, якія патрэбна было вырашыць даўно, а яны не вырашаны да цяперашняга часу.

З кансультацыямі ў нас не ўсё добра. Вазьму да прыкладу трэці курс аддзялення журналістыкі. Чамусьці ў нас запланаваны кансультацыі па тых дысцыплінах, якія зімой мы не здаем. Мы проста не разумеем, чаму гэта так. Нам патрэбны кансультацыі па беларускай мове, аднак да гэтага часу мы нават не атрымалі праграмы. Кансультацыі звычайна намячаюцца ў нядзелю. А чаму не правесці яе ў рабочы дзень, у вольны час? Некаторыя ж студэнты-завочнікі жывуць у Мінску. Чамусьці дагэтуль мы не атрымалі праграм па гісторыі беларускай мовы, гісторыі рускай літаратуры XIX стаг. і па гісторыі рускай літаратурнай мовы. Мы здаем гэтыя прадметы зімой, а праграм па гэтых прадметах няма.

Недастаткова ў нас літаратуры апошніх выданняў.

Сесія, як кажуць, на носе, і мы прыкладзем усе намаганні, каб здаць яе паспяхова.

Э. КРАСОЎСКІ,
студэнт-завочнік.

## А другая змена забыта...

Штотыднёва ў клубе нашага ўніверсітэта па панядзелках дэманструюцца мастацкія кінафільмы. Аднак некаторыя таварышы забываюць аб тым, што ў нас ёсць вялікі атрад студэнтаў, якія займаюцца ў другую змену, і якое б ні было іх жаданне паглядзець новы фільм, яно застаецца толькі жаданнем.

Было б вельмі карысным пачаць дэманстраваць карціну або два разы ў панядзелак—з раніцы і пасля абеду,—або перанесці дзень паказу кінафільмаў на нядзелю.

Студэнты чакаюць гэтага!

А. ЧАЧОТКА,
студэнт першага курса філалагічнага факультэта.

# УПЕРАДЗЕ—ДРУГІ ТУР

АДНОЙ з важных асаблівасцей камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі з'яўляецца выхаванне эстэтычнай культуры. Распаўсюджаным, пасапраўднаму ўсенародным сродкам далучэння да яе шырокіх мас народа служыць мастацкая самадзейнасць. Іменна праз удзел у самадзейным мастацтве выхоўваецца ўменне бачыць і адчуваць прыгажосць рэчаіснасці, выпрацоўваюцца цудоўныя якасці будаўнікоў камунізма.

Радасна заўважыць, што гэтымі меркаваннямі, а не казённа-фармальнымі адносінамі да справы кіраваліся ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці сярод студэнцкай моладзі дэканы, партыйныя і грамадскія арганізацыі большасці факультэтаў універсітэта. Нажаль, не ўсіх факультэтаў. На юрыдычным, часткова на матэматычным і філалагічным факультэтах да мастацкай самадзейнасці аднесліся як да справы другараднай. Гэта стала відавочным на нядаўна адбыўшымся аглядзе-конкурсе на лепшую самадзейнасць факультэта.

Як вядома, умовы конкурсу прадугледжваюць два этапы: першы—папярэдні па жанрах у канцы першага семестра для выяўлення пераможцаў-лаўрэатаў, найбольш здольнай таленавітай моладзі, якая магла б прыняць удзел у гарадскім аглядзе і папоўніць агульнаўніверсітэцкія калектывы; другі—вынікавы, заключны па факультэтах, які праводзіцца ў канцы другога семестра для канчатковага вызначэння месц факультэтаў.

ШТО ж паказаў першы этап агляду-конкурсу? Самым важным дасягненнем самадзейных калектываў трэба лічыць больш шырокі склад удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, чым у мінулыя гады. Першым аглядалася мастацкае чытанне. Характэрна, што, калі ў мінулым у аглядзе прымала ўдзел па тры—пяць чалавек ад факультэта, то сёлета толькі на хімічным, які ў мінулым годзе зусім не ўдзельнічаў, выявілася восем чалавек чытальнікаў. З іх адзін—пачынаючы паэт Іван Ласкоў, які прачытаў тры добрых і па зместу, і па форме вершы. Высокім балам былі адзначаны тут выступленні тт. Калесніквай і Васіленка.

Ад фізічнага факультэта ў конкурсе ўдзельнічала пяць чытальнікаў. Больш удалым прызнана чытанне Грыб і Сінякова.

Гістарычны факультэт прадставіў на конкурс шэсць чытальнікаў. Асабліва ўдала тут выступіў добра вядомы ўніверсітэцкаму гледачу Лашчынін. Для выступлення ён узяў «Рускі характар» А. Талстога, рэч не зусім звычайную для яго амплуа, але з ёй ён ў цэлым выдатна справіўся.

Пяць чалавек прымала ўдзел у конкурсе чытальнікаў ад біялагічнага факультэта, восем—ад філалагічнага, тры—ад геаграфічнага і два—ад матэматычнага. Высокай адзнакі заслужылі выступленні: тт. Кульша (матфак), Салееў (філфак), Рылюк (геафак). Не былі прадстаўлены чытальнікі юрфака.

Агульным недахопам рэпертуара ўдзельнікаў мастацкага чытання з'яўляецца амаль поўная адсутнасць у ім твораў беларускіх аўтараў. З тэхнічнага і арганізацыйнага боку звяртае на сябе ўвагу безгустоўнасць і самацёк у падборы матэрыялу, няўменне весці сябе на сцэне, адсутнасць выразнай дыкцыі, няўменне даносіць да гледача самае важнае—ідэю таго або іншага твора. Мала прадстаўлены, асабліва ад філфака, маладыя аўтары, пачынаючыя паэты-студэнты. Тлумачыцца ўсё гэта тым, што ва ўніверсітэце кіраўніцтвам гэтага віду мастацтва пакуль што ніхто не займаецца.

ХАРЭАГРАФІЧНАЕ мастацтва было прадстаўлена танцавальнымі калектывамі шасці факультэтаў, не ўдзельнічалі філалагічны і юрыдычны факультэты. Найбольш удала выступілі танцоры гістарычнага факультэта. Сем танцаў пры добрай якасці выканання прадставіў біялагічны факультэт. У гэтым вялікая заслуга грамадскага кіраўніка і энтузіяста Белаглаўкі. На заключны канцэрт і гарадскі агляд рэкамендаваны беларускі народны танец «Лянок» у выкананні танцавальнага калектыву геаграфічнага факультэта. Чатыры танцы падрыхтавалі на агляд хімікі. Удала выступілі ў іх студэнты вячэрняга аддзялення.

ВАКАЛЬНАЕ і харавое мастацтва прадстаўлялі пяць факультэтаў, не ўдзельнічалі юрыдычны, філалагічны і фізічны факультэты. Тут таксама адзначыліся гісторыкі. Яны прадставілі на конкурс мужчынскі секстэт, пяць вакалістаў і хор. Асабліва высока ацэнены дуэт Баранава—Рыжая, а таксама салісты Шустоўская і Мантураў. Хор гісторыкаў выдатна выканаў тры песні.

Кваліфікавана выступіў хор біялагічнага факультэта. Ён выканаў «Марш энтузіястаў» і песню П. І. Чайкоўскага «Ручьи бегут звеня».

Нядрэнна зарэкамендавалі сябе на конкурсе вакалістаў і хімікі. Хор у складзе 40 чалавек выканаў дзве песні, аднак якасць была невысокай.

Некалькі лепш выступіў хор геаграфічнага факультэта. Парадавалі і салісты геафака. Вышэйшым балам ацаніла журы выступленні Яновіча, Працкевіча і Рабушэўскай.

Чаму ж слаба выступілі на конкурсе вакалісты філалагічнага, матэматычнага, фізічнага факультэтаў? Тлумачыцца гэта адсутнасцю кваліфікаваных кіраўнікоў. Не дапамагае ў гэтым і ўніверсітэцкі хор. І наогул, паміж вакальнымі калектывамі ўніверсітэта і факультэтаў няма цеснага кантакту.

БЕДНА выглядаў конкурс аркестраў і музыкантаў-выканаўцаў. У ім удзельнічалі толькі чатыры факультэты. Лепшым быў прызнаны аркестр народных інструментаў філалагічнага факультэта (кіраўнік Дзямідзенка). Вялікая будучыня і перад эстрадным аркестрам матфака, якому, аднак, патрэбен добры кіраўнік.

Сярод асобных выканаўцаў лепшымі былі Казлоў (гістфак) і Пераверзеў (хімфак).

Як паказаў конкурс, развіццё мастацкай самадзейнасці на факультэтах трэба прызнаць нездавальняючым, асабліва на юрыдычным і філалагічным. Грамадскасць і перш за ўсё партыйныя арганізацыі гэтых факультэтаў павінны сур'ёзна абмеркаваць стан усёй культурна-масавай работы і ў першую чаргу строга спытаць з тых, хто сарваў удзел асобных калектываў у конкурсе.

Не трэба забывацца, што ўперадзе другі этап агляду конкурсу, які адбудзецца ў красавіку. Такім чынам той, хто не ўдзельнічаў у першым туры, можна паправіць свае справы вясной. Усім калектывам трэба звярнуць асаблівую ўвагу на адну з галоўных умоў конкурсу—на работу па абслугоўванню гледачоў. Гэты бок жыцця калектываў будзе з'яўляцца асноўным паказчыкам для журы пры вызначэнні месца таго ці іншага калектыву або асобнага выканаўцы.

Яшчэ лепш павінны рыхтавацца да рашаючага этапу конкурса факультэты, якія прэтэндуюць на прызавыя месцы: гістарычны, біялагічны, хімічны і геаграфічны.

В. СТАРАВОЙТАЎ,
член парткома.



Многія студэнты нашага ўніверсітэта займаюцца ў секцыі фехтавання. Гэты від спорту стаў любімым у юнакоў і дзяўчат.

НА ЗДЫМКУ: на занятках у секцыі фехтавання.

Фота А. АНЦЫФЕРАВА.

# ПАДРЫХТОЎКА ПАЧАЛАСЯ

*Важнейшае значэнне ў падрыхтоўцы географаў мае вытворчая практыка. Яна з'яўляецца лагічным працягам і завяршэннем прачытаных ва ўніверсітэце лекцый, і займае значную частку вучэбнага часу. У адрозненне ад аўдыторных заняткаў гэты перыяд з'яўляецца палявым альбо лагерна-экспедыцыйным з усімі яго цяжкасцямі і нязручнасцямі, а з другога боку,—з яго непаўторным хараством.*

*Штогод студэнты трэцяга і чацвёртага курсаў геаграфічнага факультэта накіроўваюцца на вытворчую практыку ў розныя раёны рэспублікі, дзе яны займаюцца вывучэннем прыроды, насельніцтва і гаспадаркі. Раней гэтая работа студэнтаў была мала звязана з патрэбнасцямі народнай гаспадаркі і насіла ў большасці выпадкаў акадэмічны характар.*

*Праводзячы ў жыццё Закон аб умацаванні сувязі школы з жыццём, мы змянілі гэтае становішча і максімальна наблізілі практыку да вытворчай работы. Зараз большасць студэнтаў праводзіць практыку па сваёй спецыяльнасці ва ўстановах і экспедыцыях, прычым адна трэць—у экспедыцыях факультэта. Студэнты фізіка-географы праводзяць ландшафтнае і глебавае картаванне Віцебскай і Мінскай абласцей, што мае вялікае значэнне для распрацоўкі мерапрыемстваў па паляпшэнню размяшчэння сельскай гаспадаркі і павышэнню яе эфектыўнасці. Частка студэнтаў займаецца вывучэннем грунтоў на трасах будаўніцтва шасейных дарог. Студэнты эканоміка-географы па заданню Саўнаргаса і Белдзяржпраекта даследуюць сыравінныя зоны прадпрыемстваў цукровай і кансервавай прамысловасці. З 1961 года яны будуць прымаць удзел у рабоце Белсельпраекта па планаванню сельскіх населеных пунктаў і г. д.*

*Зразумела, што ў час праходжання вытворчай практыкі студэнты завязваюць дзелавыя адносіны з арганізацыямі, якія да моманту заканчэння студэнтам вучобы, калі ён дастаткова добра праявіў сябе на практыцы, даюць на яго заяўку.*

*Хаця вытворчая практыка пачнецца з 1 чэрвеня, мы ўжо зараз рыхтуемся да яе. На пасяджэнні Савета факультэта абмеркаваны мерапрыемствы кафедр у сувязі з падрыхтоўкай да прадстаячай практыкі. У прыватнасці, удакладнены базы практыкі, распрацоўваюцца праграмы і заданні, рыхтуецца абсталяванне і г. д. Пытанне аб ходзе падрыхтоўкі кафедр факультэта да летняй практыкі абмяркоўвалася на партыйным бюро. На факультэце арганізавана выстаўка матэрыялаў з практыкі студэнтаў, якую яны праходзілі летам мінулага года.*

*І. ТРУХАН,*
*дэкан геаграфічнага факультэта.*

**Калектыў супрацоўнікаў і студэнтаў матэматычнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне дацэнту Антону Пятровічу Рабушку ў сувязі з напаткаўшым яго горам—смерцю бацькі.**

Нам. рэдактара Р. ПЛАТОНАЎ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31;
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя Ул. І. Леніна.

АТ 06241 Зак. 254.